УДК 141.311. 2(476)”18”

# ЖАНОЧЫЯ ВОБРАЗЫ Ў ПРОЗЕ ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ

***Святлана Агароднікава***
*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

У артыкуле “ Жаночыя вобразы ў прозе Э.Ажэшкі” даецца кароткі аналіз гродзенскага перыяду творчвсці Э.Ажэшкі. Усебакова раскрываюцца жаночыя вобразы твораў пісьменніццы. Даецца параўнальны аналіз вобразаў сялянак і прадстаўніц і прадстаўніц буржуазна-памешчыцкага класа. Адзначаюцца адметныя рысы характараў прадстаўніц абодвух сацыяльных слаёў

***Ключавыя словы: тэматычная разнастайнасць, сацыяльныя працэсы, жаночыя вобразы, духоўнае багацце, патрыятычныя ідэалы***

“Живая мудрость и сердце эпохи” – так назваў знакамітую польскую пісьменніцу Элізу Ажэшку вядомы літаратурны крытык Юзеф Катарбінскі. [1, с.500].

Эліза Ажэшка – адна з самых вядомых і знакамітых польскіх пісьменнікаў. Гады яе жыцця і творчасці (1841-1910) былі і гадамі станаўлення і росквіту польскай літаратуры, і яе ўдзел у гэтым не менш значны за ўдзел яе знакамітых сучаснікаў Генрыка Сенкевіча, Балеслава Пруса, Марыі Канапніцкай і больш маладых – Стэфана Жаромскага і Уладзіслава Рэйманта. Адметнасць творчасці Э.Ажэшкі, перш за ўсё, у тэматычнай шматграннасці і разнастайнасці. Літаратура была для яе формай служэння грамадству, а пісьменнік – настаўнікам жыцця. Письменніцу хвалююць усе пытанні польскага грамадскага жыцця канца 60-х – пачатку 70-х гадоў. Барацьба за свабоду і раўнапраўе жанчын, пытанні сям’і і шлюбу, выхавання і адукцыі – усе гэта знаходзіць адлюстраванне ў яе творах.

З пачаткам гродзенскага перыяду ў прозу Э.Ажэшкі трывала ўваходзіць жыццё гарадскіх нізоў: побыт і пакуты “маленькіх людзей”, бедных і цёмных. Адлюстраванню жыцця абяздоленых людзей прысвечаны знакамітыя сялянскія аповесці “Дзюрдзі” (1885) і “Хам” (1888). І менавіта ў гэтых творах пісьменніца стварае самыя яркія, самабытныя і супрацьлеглыя жаночыя вобразы – Пятрусі “Дзюрдзі” і Франкі “Хам”.

Репозиторий Полесгу

Аповесць “Дзюрдзі” – сапраўдная панарама сялянскага жыцця. Э.Ажэшка вельмі добра ведала жыццё вескі, асабліва традыцыі, звычаі і патрэбы сялян нёманскага краю. Героі яе сялянскіх аповесцей размаўляюць на сваёй мове, жывуць сваімі радасцямі і трывогамі. Вакол іх тыя самыя рэаліі, ім служаць тыя самыя прадметы, якія Э.Ажэшка бачыла ў іх хатах.

Пісьменніца не ідэалізуе герояў сваіх сялянскіх аповесцей. Яны грубыя, падчас душэўна чэрствыя, жорсткія. Аднак усё гэта – ад цяжкіх умоў жыцця. Вельмі цяжкая праца, жорсткая эксплуатацыя і беднасць робяць забойцамі чатырох сялян. На іх погляд, кузнечыха Пятруся, якую яны ведаюць з маленства, – ведзьма. Такая думка з’яўляецца не толькі ад таго, што гераіня ведае лекавыя ўласцівасці раслін і імкнецца пазбавіць аднавяскоўцаў ад іх хвароб, а і ад яе незвычайных, на думку сялян, паводзін і ўчынкаў.

З маладых гадоў Пятруся працавала на іншых людзей і даглядала старэнькую бабулю. Аднак ні цяжкая праца, ні беднасць, амаль галеча, не пазбавілі яе душэўнага хараства, унутранай прыгажосці. Пятруся – добры і чулы чалавек, здольны на глыбокія і моцныя пачуцці. Яна цярплівa і верна чакае Міхала Кавальчука з вайсковай службы. Дзяўчына разумее, што хлопец можа вярнуцца “с другим сердцем и с другой думкой”, аднак не выходзіць замуж за закаханага ў яе Сцяпана Дзюрдзі, не можа здрадзіць свайму каханню. У душы Пятруся згаджаецца нават на адзіноту, на тое, каб усё жыццё працаваць на чужых людзей; але не такі лёс выпадае на долю гераіні. Міхал Кавальчук вярнуўся ў Сухую Даліну і ажаніўся з Пятрусяй. Як яна змянілася! Яна нібы зіхацела ад шчасця! І раней яна любіла працу, любіла песню, заўсёды дапамагала людзям. А зараз “бывало идет она по деревне, увидит какую-нибудь горемыку или заморыша-ребенка, остановится и давай расспрашивать:

– А это что? А где больно? А может, это с горя? А какое горе?

Расспросив, что и как, она то даст целебной травки, то чем другим поможет горю, а если ничего не надумает, так со взрослым хоть потолкует о его беде и покачает головой, а ребенка возьмет на руки, расцелует его исхудалое тельце и тогда уж пойдет своей дорогой.” [2, с.184].

Пятруся сапраўды гатова была любіць увесь свет, аднак жыхары Сухой Даліны не змаглі зразумець яе высокую маральнасць і вялікую дабрыню.

Цяжкае жыццё, неадукаванасць пасялілі ў іх трывалую веру ў вядзьмарства, таму шлюб гераіні з Міхалам успрымаецца імі як вынік “чарадзейнага прывароту.”

Забойства цудоўнага чалавека – Пятрусі – знішчэнне “ведзьмы” браты Дзюрдзі лічаць справай нават неабходнай.

Зусім іншы, супрацьлеглы характар у Франкі, гераіні аповесці “Хам.”

Надзвычайна пранікненне Э.Ажэшкі ў душу гераіні аповесці. Вельмі праўдзіва раскрывае пісьменніца душэўную неўраўнаважанасць маладой жанчыны, мешаніну ў разуменні жыцця, мешаніну душэўнай чысціні сапсаванасці. Характар Франкі абумоўлены перш за ўсё сацыяльным асяроддзем, у якім яна вырасла. Галечу, бруд і несправядлівасць чалавечых узаемаадносін Франка ведае з дзяцінства і сама не пазбягае гэтага бруду. Зусім маладой яна паступае на службу ў багаты дом і хутка робіцца каханкай гаспадара. “ Потом она поступила горничной в другой дом и пошло.” Сутыкненне з бестурботным жыццём багацеяў разбэсціла яе розум і пачуцці, прывучыла да лёгкага жыцця. Яна шчырая, шчодрая, запальчывая і адыходлівая, а галоўнае – надзвычай гордая. І вось жанчына з такім складаным характарам становіцца жонкай селяніна, робячы, як яна паўтарае за сваімі былымі гаспадарамі, мезальянс. Каханне, а больш правільна, удзячнасць да Паўла за тое, што ён адзіны, хто па-чалавечы паставіўся да яе, хутка прайшло. Штодзённая сялянская праца радасці не прыносіла, і сэнсу ў ёй яна не бачыла. Цішыня і аднастайнасць вясковага жыцця ў адрозненне ад шуму горада палохалі і адштурхоўвалі. Над Франкай не маюць улады ніякія абеты і клятвы, яна звыклася з лёгкім жыццём і заганамі, выратаваць яе немагчыма. “Настоящая пьяница, хоть водки и не пьет...” – кажа пра яе Павел.

Э.Ажэшка, як і яе герой Павел, не асуджае Франку. Яна з глыбокім спачуваннем паказвае немінучасць гібелі маладой жанчыны. Франка не выносіць ніякага гвалту над сабой і, калі пасля чарговых “павучальных” пабояў мужа яна высыпае яму ў ежу яд, яе ў

гэтую хвіліну не можа спыніць ніякае пакаранне, і сумленне яе маўчыць. Аднак бязмежная дабрыня Паўла (моцнае здароўе і невялікая доза яду не далі яму загінуць) маральна знішчае яе. Муж Франкі, аддаўшы ўсе свае грошы, выкупае яе з рук урадніка. Цяпер вызваліць гераіню ад мук сумлення можа толькі яе ўласная смерць, і адсюль такая лагічнасць страшнай развязкі.

Не пакідае Э.Ажэшка і сваю галоўную тэму – адлюстраванне добра знаёмага ёй дваранскага асяроддзя. У 1876 годзе зьяўляецца раман “Господа Помпалинские.” У гэтым творы прадстаўлены ўсе слаі польскай шляхты. З сарказмам малюе пісьменніца вузкія інтарэсы большасці галоўных герояў свайго рамана. Клопат аб асабістым дабрабыце, пагоня за багатымі жаніхамі і нявестамі, за тытуламі і спадчынай – вось і ўсё, чым запоўнена іх жыццё. Праз гэта маральна гіне Цэцылія Пампалінская – бедная сваячка і беспасажніца. Яна доўга чакае з вандравання Станіслава Пампалінскага, які глыбока пакахаў яе і абяцаў ажаніцца з ёю. Аднак, вярнуўшыся, Станіслаў адмовіўся ад асабістага шчасця дзеля росквіту і ўзвышэння роду Пампалінскіх. У гэтым бачыць ён сэнс свайго жыцця.

Адчай, прага помсты і злосць знішчылі ў Цэцыліі яе лепшыя чалавечыя якасці: маральнасць, дабрыню, высакародства. Яна выходзіць замуж за багатага генерала Арчынскага і з дапамогай грошай творыць сапраўднае зло.

Нават тое падобнае на чалавечае пачуццё, што ў ёй захавалася, – яна збірае калекцыю карцін, з відам ідылічнага сямейнага шчасця, да самай смерці носіць пярсцёнак, падараны ёй Станіславам, – прымушае чытача задумацца, – а ці не патрэбны ёй гэтыя рэчы толькі для таго, каб падаграваць пачуццё нянавісці да ўсяго чалавецтва.

Сатырычнымі фарбамі малюе Э.Ажэшка генеральшу і яе падхалімаў-спадчыннікаў. Вобраз брыдкай старой у адкрытай сукенцы з каштоўнымі ўпрыгожаннямі, якая прымае ў халодным, нятопленым палацы знявідных сваякоў, – гэты вобраз-гратэск прымушае прыгадаць агульныя па накіраванасці апошнія сцэны “Господ Головлевых” Салтыкова-Шчадрына, што былі напісаны ў тыя ж прыблізна гады.

І ўсё ж гераіня выклікае спачуванне, калі зачытваецца яе завяшчанне. “ ... Умираю, как и жила, не примиренная с людьми и со своей жизнью, которая была жестоким недоразумением. Судьба нанесла мне два тяжких удара. Один – когда из убогой хаты отца, где я жила без забот, меня привезли в богатые палаты добрых родственников. Второй – когда я упала в обморок в парке. Более слабых ударов не счесть...” Гэтыя радкі зафяшчання Цэцыліі Арчынскай, як і яе апошні падарунак графу Станіславу Пампалінскаму (карціны, якія яна збірала, і падараны ім пярсцёнак), – абвінавачванне ўсяму складу жыцця буржуазна-памешчыцкага грамадства.

Па ідэйнай накіраванасці да “Господ Помпалинских” блізкі раман “ Над Нёманам” – адзін з лепшых твораў польскай рэалістычнай літаратуры.

У рамане “Над Нёманам” Э.Ажэшка намалявала шырокую эпічную карціну жыцця польскай правінцыі за чвэрць стагоддзя, пачынаючы з паўстання 1863 года, у якую разбурэння тысяч гаспадарак пасля падаўлення паўстання ўнесены новыя праблемы сацыяльнага і маральнага характару. Галоўная праблема ў рамане – адносіны паміж шляхтай і народам. Сімпатыі Э.Ажэшкі на баку сялян, яны яе галоўныя героі. Іх праца, чысціня іх адносін, духоўнае багацце выратоўваюць ад лёсу Цэцыліі Пампалінскай адну з самых прывабных гераінь рамана – Юстыну Ажэльскую. Яна таксама далёкая сваячка і жыве ў маёнтку Карчынскіх. Як і Цэцылія, яна цяжка перажывае здраду каханага – касмапаліта і эгаіста – Зыгмунта Карчынскага. Сустрэча з Янам Багатыровічам, чалавекам адказным, маральным і чулым, дапамагае ёй знайсці сваё месца ў жыцці. Юстына адукаваны, сур’ёзны і ўдумлівы чалавек. Яна любіць музыку, кнігі, таму бяздзейснае жыццё у карчынскім доме не можа задаволіць яе. Многімі рысамі свайго характару Юстына нагадвае Пятрусю (“Дзюрдзі”) і , хоць вобраз Юстыны раскрыты не так глыбока і ўсебакова, як вобраз Пятрусі, гераіня рамана “Над Нёманам” знаходзіць сэнс і асалоду ў сялянскай працы. Пятруся імкнецца вылечыць сваіх аднавяскоўцаў, а Юстыны – падзяліцца з сялянамі святлом і ведамі. “…А если окажется, что света и знания у меня больше, чем у него, у них... Как я буду счастлива поделиться с ними! Как я

буду горда, если внесу к ним немного света, чтобы им было виднее, яснее, радостнее!...” [3, с.375].

Дзяўчына адмаўляе арыстакрату Ружыцу і выходзіць замуж за Яна Багатыровіча, з радасцю прымаючы для сябе жыццё людзей працы.

Увогуле, жаночыя вобразы, створаныя Э.Ажэшкай, пераконваюць у высокім стаўленні пісьменніцы да людзей з народа – людзей працавітых, унутрана прыгожых і высакародных.

1. Элиза Ожешко. ГОСПОДА ПОМПАЛИНСКИЕ. ХАМ. Москва: Издательство “ Правда”, 1987.- 511с.
2. Элиза Ожешко. Избранное. ПОВЕСТИ. РОМАН. Минск: “ Наука и техника”, 1985.- 589с.
3. 3.Элиза Ожешко. НАД НЕМАНОМ. Роман. МИНСК “ НАРОДНАЯ АСВЕТА” 1986.- 381с.

## WOMEN IMAGES IN THE PROSE OF ELIZA OZHESHKO

***Sviatlana V. Aharodnikava***
*senior lecturer, Belarus State Economic University, Minsk, Belarus*

**Summary:** The article “Female Images in the Prose of E. Ozheshko” gives a brief analysis of the Grodno period of the work of E. Ozheshko. Female images of the heroines are comprehensively revealed. A comparative analysis of the images of the peasant women and representatives of the bourgeois-landowner class is given. Characteristic features of the representatives of both social strata are noted

***Keywords: thematic diversity, social processes, female images, spiritual wealth, patriotic ideals***

Репозиторий ПолесГУ